ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар Дзяржаўнай установы адукацыі "Морацкая сярэдняя школа Клецкага раёна"
___________ А.І. Чыркун
03.04.2023

# ПРАВІЛЫ
## унутранага распарадку для вучняў Дзяржаўнай установы адукацыі "Морацкая сярэдняя школа Клецкага раёна"

### I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Правілы ўнутранага распарадку для вучняў Дзяржаўнай установы адукацыі "Морацкая сярэдняя школа Клецкага раёна" (далей - Правілы) распрацаваны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей – Кодэкс), пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.12. 2011 №283 Аб зацвярджэнні Палажэння аб установе агульнай сэрэдняй адукацыі", Тыпавымі правіламі ўнутранага распарадку для вучняў установ агульнай сярэдняй адукацыі.

1.2. Правілы ўстанаўліваюць нормы паводзін вучняў у памяшканні і на тэрыторыі ўстановы адукацыі з мэтай стварэння абстаноўкі, якая садзейнічае паспяховаму навучанню кожнага вучня, выхаванню павагі да яго асобы і правоў, развіццю культуры паводзін і навыкаў зносін, падтрыманню парадку ва ўстанове адукацыі.

1.3. Згодна з Правіламі ўсе вучні маюць аднолькавыя правы і абавязкі, нясуць аднолькавую адказнасць за парушэнне норм паводзін ва ўстанове адукацыі.

1.4. Ва ўстанове адукацыі на пачатак навучальнага года распрацоўваюцца Правілы ўнутранага распарадку для вучняў і зацвярджаюцца дырэктарам.

1.5. Змяненні і дапаўненні ў Правілы ўносяцца ў парадку, вызначаным падпунктам 1.4. дадзеных Правілаў.

1.6. Правілы даводзяцца да ведама:

педагагічных работнікаў установы адукацыі – на першым пасяджэнні педагагічнага савета ці нарадзе пры дырэктару новага навучальнага года;

вучняў установы адукацыі – на першай класнай гадзіне новага навучальнага года;

законных прадстаўнікоў вучняў – на першым бацькоўскім сходзе новага навучальнага года (пад подпіс).

1.7. Правілы распаўсюджваюцца на ўсіх вучняў установы адукацыі.

1.8. Правілы размяшчаюцца ў даступным для агляду ўсімі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу месцы і на афіцыйным сайце ўстановы адукацыі.

## II. АСНОЎНЫЯ ПРАВЫ ВУЧНЯЎ

2.1. Вучні маюць права на:

атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі і праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі;

стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцей іх псіхафізічнага развіцця;

атрыманне дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў адпаведнасці з Кодэксам і ў парадку, які вызначаны Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2011 №149;

павагу сваёй чалавечай годнасці, абарону ад прымянення фізічнага і (ці) псіхічнага насілля, жорсткага, грубага ці зняважлівага абыходжання, абразы;

абарону жыцця і здароўя ў час адукацыйнага працэсу;

карыстанне падручнікамі (вучэбнымі дапаможнікамі) у адпаведнасці з заканадаўствам;

бясплатнае карыстанне бібліятэкай, вучэбнай і спартыўнай базай установы адукацыі;

удзел у кіраванні ўстановай адукацыі ў адпаведнасці са Статутам установы адукацыі (далей – Статут);

адпачынак на перапынках, арганізацыю вольнага часу ў перыяд канікул;

стварэнне спрыяльных умоў для самаадукацыі;

аб’ектыўную ацэнку ведаў;

захаванне месца ва ўстанове адукацыі ў выпадку накіравання для навучання і лячэння ў санаторную школу-інтэрнат;

навучанне на ўроках фізічнай культуры і здароўя ў адпаведнасці з групай здароўя;

наведванне стымулюючых і падтрымліваючых заняткаў;

выбар факультатыўных заняткаў у межах устаноўленай вучэбным планам установы адукацыі колькасцю гадзін факультатыўных заняткаў і з улікам максімальнай дапушчальнай нагрузкі на аднаго вучня, устаноўленай спецыфічнымі санітарна-эпідэміялагічнымі патрабаваннямі да ўтрымання і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі;

вывучэнне асобных прадметаў на павышаным узроўні ў адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі;

атрыманне дадатковых адукацыйных паслуг (у тым ліку платных) з ліку паслуг, якія ўстанаўліваюцца ўстановай;

атрыманне гарачага харчавання ў парадку, вызначаным заканадаўствам;

удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, канферэнцыях спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых і іншых адукацыйных і выхаваўчых мерапрыемствах;

заахвочванне за поспехі ў вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай дзейнасці, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;

атрыманне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і псіхалагічнай дапамогі;

удзел у дзіцячых, маладзёжных і іншых грамадскіх аб'яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

абарону ад любых супрацьпраўных замахаў;

удзел у органах вучнёўскага самакіравання ва ўстанове адукацыі;

недатыкальнасць асобы.

2.2. Іншыя правы вучняў устанаўліваюцца Кодэксам, іншымі актамі заканадаўства, дакументамі заснавальніка і іншымі лакальнымі нарматыўнамі прававымі актамі ўстановы адукацыі.

## III. АСНОЎНЫЯ АБАВЯЗКІ ВУЧНЯЎ

3.1. Вучні абавязаны:

выконваць Статут, рашэнні органаў самакіравання установы адукацыі, Правілы, патрабаванні кіраўніцтва і педагагічных работнікаў;

знаходзіцца ва ўстанове адукацыі на працягу часу, прадугледжанага раскладам заняткаў (вучэбных, факультатыўных, аб'яднанняў па інтарэсах, іншых). Пакідаць тэрыторыю ўстановы адукацыі ў час заняткаў толькі з дазволу класнага кіраўніка (дзяжурнага настаўніка);

добрасумленна і адказна адносіцца да засваення зместу вучэбных праграм па вучэбных прадметах, праграм выхавання, своечасова і якасна выконваць дамашнія заданні, грамадскія даручэнні;

наведваць класныя і інфармацыйныя гадзіны;

удзельнічаць у мерапрыемствах грамадска карыснай працы;

вырашаць спрэчныя і канфліктныя пытанні на прынцыпах узаемнай павагі, з улікам усіх (іншых) удзельнікаў спрэчкі. Пры неабходнасці звяртацца за дапамогай да настаўніка, класнага кіраўніка,
спецыялістам сацыяльна-педагагічнай службы, кіраўніцтва ўстановы адукацыі;

беражліва адносіцца да маёмасці ўстановы адукацыі, падтрымліваць чысціню і парадак ва ўстанове адукацыі і на яе тэрыторыі, беражліва адносіцца да энергарэсурсаў, берагчы цеплыню, электрычнасць, ваду;

паважаць гонар і годнасць усіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, работнікаў установы адукацыі;

клапаціцца аб сваім здароўі, бяспецы і жыцці іншых асоб, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця, самаўдасканалення;

адразу паведамляць настаўніку (класнаму кіраўніку) ці дзяжурнаму настаўніку (члену кіраўніцтва) аб атрыманні мікратраўмы, траўмы ці пагаршэння агульнага стану свайго здароўя на ўроках, занятках ці пры правядзенні мерапрыемстваў (пазакласных, пазашкольных, спартыўна-масавых, грамадска карыснай працы);

загадзя (за некалькі дзён) паведамляць класнаму кіраўніку аб плануемым наведванні арганізацыі аховы здароўя, у экстранных (незапланаваных) выпадках адсутнасці на ўроках неадкладна паведаміць класнаму кіраўніку аб факце і прычыне сваёй адсутнасці;

размяшчаць сродкі сувязі, інтэрнэт-сувязі перад пачаткам вучэбных заняткаў у спецыяльна адведзеным месцы (скрынцы);

прытрымлівацца дзелавога стылю адзення, выкарыстоўваць адзенне для заняткаў фізічнай культурай згодна з санітарнымі нормамі, спецыяльнае адзенне на ўроках працоўнага навучання, мерапрыемствах грамадска карыснай працы;

мець на ўроках неабходныя вучэбныя прылады;

мець акуратна і разборліва падпісаныя рабочыя сшыткі і сшыткі для кантрольных работ па прадметах;

акуратна і разборліва запісваць у дзённік расклад урокаў на тыдзень уперад, у канцы кожнага ўрока – дамашняе заданне;

кожны тыдзень здаваць дзённік на праверку класнаму кіраўніку;

прад’яўляць дзённік па першым патрабаванні педагагічнага работніка ўстановы адукацыі;

выконваць правілы паводзін у бібліятэцы і правілы карыстання бібліятэчным фондам.

3.2 Вучням ва ўстанове адукацыі і на яе тэрыторыі катэгарычна забараняецца:

не выконваць патрабаванні педагагічных работнікаў;

курыць, ужываць алкагольныя (слабаалкагольныя) напоі і піва, таксічныя і наркатычныя рэчывы, выкарыстоўваць нецэнзурныя выразы, спазняцца на вучэбныя заняткі без уважлівай прычыны, наносіць шкоду маёмасці ўстановы адукацыі і іншым асобам;

прыносіць агнястрэльную зброю любога выгляду, газавую зброю, боепрыпасы любога выгляду ці выбуховыя рэчывы (або іх імітатары ці муляжы), халодную зброю, колючыя, рэжучыя прадметы (або іх імітатары або муляжы), хімічныя, ядавітыя, вогненебяспечныя рэчывы, тытунёвыя вырабы, электронныя сродкі курэння, вадкасці для электронных сродкаў курэння, сродкі для ўжывання тытуню, запалкі, запальнічкі, алкагольныя, слабаалкагольныя напоі і піва, наркатычныя рэчывы, псіхатропныя рэчывы, іх пракурсоры і аналагі, таксічныя і іншыя

адурманьваючыя рэчывы і прэпараты, якія могуць нанесці шкоду маёмасці і здароўю акружаючых, а таксама прылады для азартных гульняў;

парушаць дысцыпліну ў ходзе адукацыйнага працэсу, прымяняць фізічную сілу і знявагу ў адносінах да іншых яго ўдзельнікаў;

прапускаць заняткі без уважлівай прычыны і своечасова інфармаваць класнага кіраўніка або дзяжурнага настаўніка з наступным прад’яўленнем адпаведнага дакумента класнаму кіраўніку;

карыстацца сродкамі мабільнай сувязі, інтэрнэт-сувязі, музычнымі калонкамі, гульнявымі прыстасаваннямі ў час адукацыйнага працэсу без дазволу педагогаў;

прапагандзіраваць, захоўваць і распаўсюджваць пры дапамозе сродкаў мабільнай, інтэрнэт-сувязі інфармацыю, якая змяшчае жорсткасць, насілле;

праводзіць здымкі ў час правядзення вучэбных заняткаў, класных гадзін, пазакласных мерапрыемстваў без дазволу кіраўніцтва, класнага кіраўніка, настаўніка-прадметніка;

размаўляць у час вучэбных заняткаў, выкрыкваць нецэнзурныя словы і выразы, перашкаджаць правядзенню вучэбнага занятка;

ужываць у час вучэбных заняткаў ежу і напоі;

перасаджвацца за іншую парту без дазволу настаўніка;

рабіць якія-небудзь запісы ў падручніках, вырываць з іх старонкі;

у час вучэбных заняткаў і перапынкаў паміж імі гуляць у азартныя гульні, праводзіць аперацыі спекулятыўнага характару;

пакідаць установу адукацыі да заканчэння вучэбных заняткаў без пагаднення з класным кіраўніком і (ці) кіраўніцтвам установы.

## IV. ПАТРАБАВАННІ ДА ЗНЕШНЯГА ВЫГЛЯДУ ВУЧНЯЎ

4.1. Вучні абавязаны прытрымлівацца дзелавога стылю адзення, якое прызначана для наведвання імі вучэбных заняткаў ва ўстанове адукацыі.

4.2. Установа адукацыі сумесна з папячыцельскім саветам маюць права выбару мадэлі, колеру і якасці тканіны, з якой вырабляецца адзенне дзелавога стылю.

4.3. Адзенне дзелавога стылю ва ўстанове адукацыі ўключае ўсябе наступныя элементы:

для хлопчыкаў – трыкатажная камізэлька сіняга колеру, штаны дзелавога стылю сіняга колеру, белая кашуля для ўрачыстых мерапрыемстваў, кашуля светлых таноў на кожны дзень, шэўрон з эмблемай школы;

для дзяўчынак – трыкатажная камізэлька сіняга колеру, спадніца або штаны дзелавога стылю сіняга колеру, белая блузка для ўрачыстых мерапрыемстваў, блузка светлых таноў на кожны дзень, шэўрон з эмблемай школы.

У зімовы час у камплект можа ўваходзіць трыкатажны швэдар ці камізэлька.

4.4. Пры наведванні вучнямі вучэбных заняткаў не дапускаецца:

спартыўнае адзенне і абутак, прызначаны для заняткаў фізічнай культурай і спортам;

рэчы, якія маюць яркія малюнкі;

бруднае, скамечанае і іншае адзенне, не прызначанае для наведвання ўстановы адукацыі;

джынсы, кароткія сукенкі і спадніцы;

верхняе адзенне і галаўныя уборы;

біжутэрыя, пірсінг, яркі экстравагантны макіяж, манікюр (штучныя пазногці) і колер валасоў, святочныя прычоскі, і аксэсуары, якія адлюстроўваюць сімволіку музычных груп і розных напрамкаў маладзёжных субкультур і спартыўных клубаў.

4.5. Спрэчныя пытанні, звязаныя са знешнім выглядам вучня, вырашае кіраўніцтва ўстановы адукацыі.

## V. ПАРАДАК НАВЕДВАННЯ ВУЧНЯМІ ВУЧЭБНЫХ ЗАНЯТКАЎ

5.1. Вучэбныя заняткі, класныя і інфармацыйныя гадзіны праводзяцца па раскладзе ці ў адпаведнасці з графікам, зацверджаным кіраўніком установы адукацыі, і з'яўляюцца абавязковымі для наведвання ўсімі вучнямі.

5.2. У выпадку невыканання дамашняга задання па якой-небудзь прычыне вучань да пачатку ўрока абавязаны паведаміць аб гэтым настаўніку.

5.3. Не пазней чым за 5 хвілін да пачатку ўрока кожны вучань:

займае месца ў вучэбным кабінеце (класе), вызначанае класным кіраўніком;

рыхтуе неабходныя для работы на ўроку падручнікі і вучэбныя прылады;

выключае сродак мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі), кладзе яго ў прызначанае для гэтага месца (скрынку).

5.4. Пры ўваходзе настаўніка ў клас вучань абавязаны ўстаць у знак прывітання.

5.5. Вучні, якія спазніліся на ўрок, абавязаны растлумачыць настаўніку прычыну спазнення.

5.6. У час урокаў вучні ўважліва слухаюць тлумачэнні настаўніка і адказы іншых навучэнцаў, не дапускаючы каментарыяў і рэплік з месца.

5.7. Пры адказе на пытанне настаўніка вучань устае. З дазволу настаўніка магчымы адказ з месца.

5.8. Аб сваёй гатоўнасці да адказу або аб ўзнікшым у ходзе адказу пытанні вучань інфармуе, падымаючы руку.

5.9. Дапаўненні і выпраўленні адказаў іншых вучняў магчымы толькі з дазволу настаўніка.

5.10. У час правядзення самастойных і кантрольных работ вучні выконваюць іх самастойна. Дапамога іншых вучняў не дапускаецца. Дазваляецца карыстацца толькі тымі матэрыяламі, якія пералічаны настаўнікам.

5.11. Выкананне патрабаванняў настаўніка на ўроку з'яўляецца для вучняў абавязковым і безумоўным.

5.12. У выпадку, калі вучань не выконвае патрабаванні настаўніка, парушае дысцыпліну ў час урока, настаўнік інфармуе аб гэтым дзяжурнага настаўніка і вучань вызваляецца з урока ў суправаджэнні дзяжурнага настаўніка.

5.13. У выпадку, калі патрабаванні настаўніка парушаюць правы вучня, апошні можа праінфармаваць аб гэтым дзяжурнага настаўніка.

5.14. Дзяжурны настаўнік выклікае ва ўстанову адукацыі законнага прадстаўніка вучня, а пры неабходнасці – супрацоўніка тэрытарыяльнага органа ўнутраных спраў.

5.15. Дзяжурны настаўнік пасля вывучэння сітуацыі мае права дазволіць вучню прысутнічаць на астатніх уроках.

5.16. У выпадку, калі законны прадстаўнік не прыбывае ва ўстанову адукацыі ў кароткі тэрмін, дзяжурны настаўнік мае права забраць вучня з любога наступнага ўрока для разбіральніцтва пасля прыбыцця законнага прадстаўніка ва ўстанову адукацыі.

5.17. У час урока вучань павінен сачыць за сваёй паставай.

5.18. Званок аб заканчэнні ўрока даецца для інфармавання настаўніка і вучняў аб заканчэнні занятка. Вучні пакідаюць клас толькі з дазволу настаўніка.

5.19. Для заняткаў на ўроках фізічнай культуры і здароўя вучні пераапранаюцца ў спартыўную форму.

5.20. Пасля заканчэння ўрока вучні наводзяць парадак на рабочым месцы.

5.21. У выпадку пропуска заняткаў па хваробе ці вучні ці законныя прадстаўнікі інфармуюць класнага кіраўніка аб прычыне адсутнасці ў вуснай форме.

5.22. У дзень выхаду на заняткі вучань прад'яўляе тлумачэнні аб уважлівай прычыне пропуска заняткаў.

Уважлівай прычынай лічыцца:

хвароба вучня, наведванне ўрача (прад'яўляецца адпаведная медыцынская дакументацыя);

экстраны выпадак у сям'і, які патрабуе асабістага ўдзелу вучня (пацвярджаюцца заявамі законных прадстаўнікоў);

пропуск заняткаў па дамоўленасці з кіраўніцтвам (па пісьмовай заяве законных прадстаўнікоў);

удзел у прадметных алімпіядах, спаборніцтвах і іншых мерапрыемствах (вызначаецца загадам кіраўніка ўстановы адукацыі).

5.23. Дзяжурства вучняў:

ва ўстанове адукацыі з ліку вучняў VIII-X класаў назначаюцца дзяжурныя, якія дапамагаюць дзяжурнаму настаўніку падтрымліваць дысцыпліну ў час перапынкаў, чысціню і парадак ва ўстанове.

5.24. У кожным класе назначаецца ў адпаведнасці з графікам дзяжурны па класе, які ў час перапынка дапамагае настаўніку падрыхтаваць клас да ўрока: раздае вучэбныя дапаможнікі і сшыткі вучняў, дапамагае падрыхтаваць да ўрока іншыя вучэбна-метадычныя дапаможнікі.

5.25. З ліку вучняў VIII-X назначаюцца дзяжурныя па сталовай, якія перад раздачай ежы мыюць рукі з мылам, надзяваюць галаўныя ўборы, фартухі.

## VI. ПРАВІЛЫ ПАВОДЗІН ВУЧНЯЎ

6.1. Парадак знаходжання вучняў на перапынку.

6.1.1. Перамена прызначана:

для пераходу ў іншы кабінет (пры неабходнасці) у адпаведнасці з раскладам вучэбных заняткаў;

адпачынку і фізічнай размінкі;

прыёму ежы;

праветрывання класа, для чаго вучням неабходна выйсці з класа;

падрыхтоўкі да ўроку.

6.1.2. Пры руху па калідорах, лесвіцах, праходах навучэнцам неабходна прытрымлівацца правага боку.

6.1.3. Падчас перапынкаў вучням забараняецца:

шумець, перашкаджаць адпачываць іншым, бегаць па лесвіцах, паблізу аконных праёмаў і ў іншых месцах, не прыстасаваных для гульняў;

штурхаць адзін аднаго, кідацца прадметамі і ўжываць фізічную сілу для рашэння любога роду канфліктных сітуацый;

катацца ва ўстанове адукацыі і на яго тэрыторыі на веласіпедах, самакатах і іншых сродках перамяшчэння;

ўжываць непрыстойныя выразы і жэсты ў адрас іншых вучня, іншых асоб, запалохваць, займацца вымагальніцтвам. Парушэнне гэтага пункта

цягне за сабой прымяненне мер, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6.2. Парадак знаходжання вучняў у сталовай.

6.2.1. У сталовую вучні ходзяць арганізавана, у суправаджэнні настаўніка, які праводзіў урок.

6.2.2. Вучні выконваюць правілы гігіены: ўваходзяць у памяшканне сталовай без верхняй вопраткі, мыюць рукі перад ядой.

6.2.3. Вучні выконваюць патрабаванні работнікаў сталовай, праяўляюць увагу і асцярожнасць пры атрыманні і ўжыванні гарачых і вадкіх страў.

6.2.4. Толькі ў сталовай дазваляецца ўжываць стравы, напоі, прадукты харчавання, набытыя ў сталовай, буфеце і прынесеныя з сабой. Падчас прыёму ежы вучні павінны выконваць культуру харчавання.

Кожны вучань прыбірае за сабой сталовыя прыналежнасці і посуд у спецыяльна адведзеныя месцы.

6.3. Парадак знаходжання вучняў у спартыўнай зале.

6.3.1. Заняткі ў спартыўнай зале арганізуюцца ў адпаведнасці з графікам яго работы.

6.3.2. Наведванне заняткаў у спартыўнай зале дапускаецца толькі ў спартыўнай форме і зменным абутку.

6.3.3. Забараняецца знаходзіцца ў спартыўнай зале без настаўніка або іншага педагагічнага работніка.

6.3.4. Заняткі ў пазаўрочны час у спартыўнай зале арганізуюцца па раскладзе спартыўных секцый.

6.4. Парадак знаходжання вучняў у санітарных пакоях.

6.4.1. Пры карыстанні санітарнымі пакоямі вучні павінны падтрымліваць чысціню і парадак, выконваць правілы асабістай гігіены.

6.4.2. Забараняецца затрымлівацца ў санітарным пакоі без патрэбы, а таксама смяціць, паліць, прымаць ежу, напоі, кідаць у ракавіны і ўнітазы староннія прадметы.

6.5. Парадак знаходжання вучняў у гардэробе.

6.5.1. Па заканчэнні заняткаў (вучэбных, факультатыўных, стымулюючых, падтрымліваючых, аб'яднанняў па інтарэсах), пазакласных мерапрыемстваў вучні пад кіраўніцтвам настаўніка, які праводзіў заняткі, ідуць у гардэроб. Вучні ў парадку чарговасці забіраюць сваю вопратку, падтрымліваюць парадак і меры бяспекі.

У выпадку выяўлення страты адзення або абутку вучань абавязаны паведаміць аб тым, што здарылася класнаму кіраўніку або дзяжурнаму настаўніку.

Вучні не пакідаюць у кішэнях верхняй вопраткі ключы ад дому, грошы, праязныя дакументы, прылады сувязі (інтэрнэт сувязі) і іншыя каштоўныя рэчы.

У выпадку выяўлення пакінутых і (або) забытых кімсьці ў гардэробе рэчаў навучэнцы перадаюць іх вахцёру або дзяжурнаму настаўніку.

6.6. Парадак наведвання вучнямі мерапрыемстваў у пазаўрочны час.

6.6.1. Вучням забараняецца спазняцца на мерапрыемствы, якія праводзяцца ў пазаўрочны час.

6.6.2. Прысутнасць на мерапрыемствах, якія праводзяцца ў пазаўрочны час ва ўстанове адукацыі, асоб, якія не навучаюцца ў гэтай установе адукацыі, дапушчальна толькі з дазволу адказнага за правядзенне мерапрыемства (намесніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце, дзяжурнага настаўніка).

6.6.3. Вучні, якія прысутнічаюць на мерапрыемствах у пазаўрочны час ва ўстанове адукацыі, і асобы, якія не навучаюцца ў гэтай установе адукацыі, дапушчаныя да ўдзелу ў мерапрыемстве, павінны мець ахайны знешні выгляд, адпавядаючы ўзросту макіяж.

6.6.4. Не дазваляецца прысутнасць у верхняй вопратцы і галаўных уборах на мерапрыемствах, якія праводзяцца ў актавай, спартыўнай залах, іншых памяшканнях установы адукацыі.

6.6.5. Прыход і адыход з мерапрыемства ажыццяўляецца арганізавана, у парадку, устаноўленым адказным за правядзенне мерапрыемства.

6.6.6.Вучні абавязаны выконваць інструкцыі аб мерах бяспекі для навучэнцаў, прадугледжаныя для канкрэтнага мерапрыемства, і выконваць у поўным аб'ёме патрабаванні адказнага за правядзенне мерапрыемства.

6.6.7. Да заняткаў у спартыўных секцыях, удзелу ў спартыўных спаборніцтвах вучні дапускаюцца з дазволу ўрача, да турыстычных паходаў – з дазволу медыцынскага работніка.

6.6.8. Грамадска карысная праца вучняў у пазаўрочны час праводзіцца не раней чым праз 20 хвілін пасля заканчэння ўрокаў. Працягласць грамадска карыснай працы і віды работ вызначаюцца Санітарнымі нормамі, правіламі і гігіенічнымі патрабаваннямі.

## VII. ПРАВІЛЫ КАРЫСТАННЯ СРОДКАМІ МАБІЛЬНАЙ СУВЯЗІ

7.1. У будынку ўстановы адукацыі вучні абавязаны перавесці сродак мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі) у рэжым вібравызава ці бязгучны рэжым.

7.2. У час правядзення ўрокаў, факультатыўных, стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў, заняткаў у аб’яднаннях па інтарэсах, пазакласных мерапрыемствах сродкі мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі) павінны знаходзіцца у прызначаным прыстасаванні (скрынцы) у выключаным стане.

7.3. Карыстацца сродкамі мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі) у час вучэбных, факультатыўных, стымулюючых, падтрымліваючых заняткаў,

заняткаў у аб’яднаннях па інтарэсах, пазакласных мерапрыемствах можна толькі з дазволу настаўніка.

7.4. Карыстацца сродкамі мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі ва ўстанове адукацыі ў час перапынкаў (тэлефанаваць, адпраўляць паведамленні) вучням дазваляецца толькі для аператыўнай сувязі з законнымі прадстаўнікамі, братамі (сёстрамі), іншымі блізкімі сваякамі толькі ў выпадках тэрміновай неабходнасці.

7.5. У выпадку неаднаразовага парушэння правілаў карыстання сродкамі мабільнай сувязі (інтэрнет-сувязі) вучні павінны напісаць тлумачальную запіску з указаннем прычыны парушэння дадзеных правіл. Класным кіраўніком (настаўнікам) вучню робіцца запіс у дзённік.

7.6. Пры паўторным факце парушэння правіл карыстання сродкамі мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі) праводзіцца канфіскацыя тэлефона ў вучня. Ва ўстанову адукацыі запрашаюцца бацькі (законныя прадстаўнікі), і пасля гутаркі з дырэктарам (членам кіраўніцтва) ім вяртаецца сродак мабільнай сувязі (інтэрнэт-сувязі). На вучня накладаецца спагнанне, якое вызначаецца дырэктарам установы адукацыі.

## VIII. ЗААХВОЧВАННІ І ДЫСЦЫПЛІНАРНАЯ АДКАЗНАСЦЬ ВУЧНЯЎ

8.1. У якасці заахвочвання да вучняў могуць прымяняцца наступныя меры:

аб’яўленне падзякі;

узнагароджанне граматай;

узнагароджанне каштоўным падарункам;

занясенне на дошку гонару ўстановы адукацыі;

напісанне ліста падзякі законным прадстаўнікам.

Заахвочванне аб’яўляецца загадам дырэктара. Выпіска з загада захоўваецца ў асабовай справе вучня.

8.2. За здзяйсненне вучнем дысцыплінарнага правіннасці (у тым ліку неаднаразовае парушэнне Статута і Правілаў для вучняў) устанаўліваецца дысцыплінарная адказнасць, якая выражаецца ў прымяненні да яго наступных мер дысцыплінарнага спагнання:

заўвага;

вымова;

адлічэнне.

8.3. Адлічэнне як мера дысцыплінарнай адказнасці можа быць прыменена да вучня, які атрымлівае навучанне і выхаванне на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

8.4. Права выбару меры дысцыплінарнага спагнання належыць дырэктару ўстановы адукацыі.

8.5. Звесткі аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання даводзяцца да ведама законных прадстаўнікоў непаўналетняга вучня.

Намеснік дырэктара
па вучэбна-выхаваўчай рабоце М.К.Крыцкая